Сп. В. Д. Селяменеву,
галоўнаму архівісту
Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь
пр. Незалежнасці, 116
220114 г. Мінск

Сп-ні Н. В. Кірылавай,
каардынатару праекту
Беларускі фонд міру
вул. Старажоўская, 5
220029 г. Мінск

Вячоркі Аляўціны Сямёнаўны,
вул. К.Маркса, 42-26,
220030 г. Мінск

Шаноўная Наталля Віктараўна, шаноўны Вячаслаў Дзмітрыевіч,

Высылаю Вам дакументальныя пацверджанні пацярпелых і сведак трагедыі знішчэння ў часе Другой сусветнай вайны вёскі Рубрын Мерлінскага с/с Давыд-Гарадоцкага р-на Пінскай вобласці (цяпер тэрыторыя Столінскага р-на Брэсцкай вобл.).

Збор успамінаў ускладняецца тым, што жыхары Мерлінскага і Храпуньскага с/с ужо Столінскага р-на былі выселеныя ў 1961—1962 г. з прычыны стварэння там вайсковага палігону. Тым большае жаданне былых мерлінцаў ды іхніх нашчадкаў зберагчы ў памяці пакаленняў гісторыю родных мясцінаў.

Я скантактавалася з **Іванам Сцяпанавічам Маслам** (Масло), 1934 г. н., цяпер жыве ў пас. Палескім (б. Крастунова): вул. Калініна, 13, пас. Палескі, 225671 Лунінецкі р-н, Брэсцкая вобл., тэл. 8-01647-77420.

Ён, сярод іншага, расказаў пра трагедыю вёскі **Рубры́н** (частка Хутароў Мерлінскіх) у часе Другой сусветнай вайны *(гл. Дадатак 1-1)*. Паводле перапісу 1921 г. (“Памяць. Столінскі раён”. Мн.: БелТА, 2003. С. 160), на Рубрыне́ былі 142 жыхары, 45 хатаў. І. С. Масла з памяці ўзнавіў імёны 11 жыхароў Рубрына́, якія загінулі падчас карнай аперацыі ўзімку 1943 г. *(гл. Дадатак 1-2)*.

Факт знішчэння мірных жыхароў вёскі Рубрын таксама пацвердзілі:

**Рафаловіч (Масла) Ніна Сцяпанаўна**, 1930 г. н., вул. Калініна, 10, пас. Палескі, 225671 Лунінецкі р-н, Брэсцкая вобл., тэл. 8-01647-77327;

**Ярмоліч (Рафаловіч) Юлія Данілаўна**, 1935 г. н., вул. Калініна, 18, пас. Палескі, 225671 Лунінецкі р-н, Брэсцкая вобл., тэл. 8-01647-77501;

**Масла Іосіф Піліпавіч**, 1938 г. н., і ягоная жонка **Масла Соф’я Сямёнаўна**, 1939 г. н., вул. Калініна, 12, пас. Палескі, 225671 Лунінецкі р-н, Брэсцкая вобл., тэл. 8-01647-77357.

Іхнія ўспаміны запісаныя мною праз тэлефон *(гл. Дадатак 2)*. На жаль, іх дзіцячая памяць не захавала дакладнай даты трагедыі (а рубрынцаў-сведак больш сталага веку ўжо няма ў жывых).

Факт знішчэння Рубрына ўскосна пацвярджаецца і тым, што ў згаданай кнізе “Памяць”, с. 202—216, сярод асуджаных паводле крымінальных артыкулаў і пазней рэабілітаваных названы толькі адзін чалавек – Рафаловіч Адам Антонавіч, ляснік Сцвіжскага лясніцтва,

асуджаны 14.06.1941 г. Відавочна, у пасляваенныя гады проста не было каго назваць "кулакамі" і рэпрэсаваць, бо замест Рубрына было папялішча.

Аднак у пераліку населеных пунктаў рэгіёна, цалкам ці часткова знішчаных разам з жыхарамі ў часе вайны, няма вёскі Рубрын ("Памяць…". С. 229). У раздзеле "Мірныя жыхары – ахвяры тэрору" (с. 302-314) наогул няма звестак з Мерлінскага і Храпуньскага с/с.

Я задавала гэтае пытанне дырэктару Давыд-Гарадоцкага музея Міхаілу Паўлавічу Бразоўскаму (тэл. 8-01655-52261); звярталася да супрацоўнікаў музея г. Століна, якія, дарэчы, удзельнічалі ва ўкладанні кнігі "Памяць"; усе яны ведаюць факт знішчэння Рубрына карнікамі, але не адлюстравалі яго ў кнізе *(гл. Дадатак 3).*

Я таксама звярталася ў навуковы аддзел мемарыяльнага комплекса "Хатынь", у адпаведны аддзел Дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Звестак пра знішчэнне вёскі Рубрын і яе жыхароў няма і там.

Але жывыя сведкі знішчэння ўсе ўпэўненыя, што іх малая радзіма – вёска Рубрын – ёсць у спісе спаленых вёсак Беларусі.

Станоўчы адказ на свой запыт ад 19.11.2010 я атрымала вельмі аператыўна з Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь (10.12.2010, *гл. Дадатак 4-1*), дзе факт знішчэння в. Рубрын быў пацверджаны дакументальна на падставе данясення разведкі ад 30.01.1944 у штаб партызанскай брыгады "Савецкая Беларусь", што месціўся на Мерлінскіх хутарах, ва ўрочышчы Мужын, аб знішчэнні вёскі карнікамі *(гл. Дадатак 4-2).*

Адпаведна ўзнікла было пытанне разыходжання датаў: студзень 1943 ці студзень 1944 г.

Часткова адказ на яго даў І. С. Масла, які ва ўспамінах удакладніў: пасля першага налёту карнікаў на Рубрын у студзені 1943 г. заставаліся некранутыя дзве хаты, дзе да наступнай зімы жылі людзі і стаялі партызанскія пасты. Гэтыя дзве хаты былі знішчаныя наступнай зімой – у 1944 г.

Пытанне храналогіі было канчаткова знятае пасля знаёмства з публікацыяй **мемуараў Пятра Іванавіча Скрыпскага "З успамінаў партызана"** (Гістарычны альманах. Том 11. Гродна, 2005. С. 202—227. http://kamunikat.org/histaryczny_almanach.html?pubid=2205 ). П. І. Скрыпскі падрабязна апісвае падзеі, звязаныя са знішчэннем в. Рубрын і яе жыхароў (с. 207—208 згаданай публікацыі; тэкст і біяграфію П. І. Скрыпскага гл. у *Дадатку 5*), і датуе іх студзенем 1943 года.

Апісанне агульнага кантэксту тых трагічных падзеяў ва ўсіх сведкаў збольшага супадае, яны дапаўняюць адзін аднаго. У П. І. Скрыпскага, які на час падзеяў быў ужо дарослы (23 гады) і адукаваны, у памяці захавалася больш дэталяў. На жаль, яго ўжо няма сярод жывых.

П. І. Скрыпскі дадае імя яшчэ адной ахвяры – Івана Паўлавіча Масла – і падрабязна апісвае ягоную смерць. Пазнаёміўшыся з успамінамі П. І. Скрыпскага, І. С. Масла таксама ўзгадаў гэты эпізод.

Такім чынам, ахвяраў у Рубрыне было прынамсі дванаццаць.

Яшчэ адно пытанне – розначытанне трох імёнаў ва ўспамінах П. І. Скрыпскага і І. С. Масла. Апошні пасля прачытання тэксту П. І. Скрыпскага адрэагаваў на розначытанні наступным чынам:

1. Масла Сарафіна Сцяпанаўна (не Мальвіна, як піша П. І. Скрыпскі). Гэта сястра І. С. Масла, таму, натуральна, ён памятае імя дакладна.

2. Масла Насця ці Варвара, як піша П. І. Скрыпскі. І. С. Масла ўспамінае, што для дзяцей яна была “цётка”, а “па-вулічнаму” гэтую жанчыну называлі “Керанка”, імя не ўжывалі, таму не настойвае на сваёй версіі яе імя.
3. Яе сын Масла Адольф ці Леанід, як піша П. І. Скрыпскі. І. С. Масла настойвае, што яго звалі Адольф, бо гэта быў хлопчык, з якім ён часта гуляў.

Цяпер дапоўнены і скарэктаваны спіс ахвяраў трагедыі 1943 г. у Рубрыне выглядае так:

1. **Рафаловіч Алесь (Аляксандр) Кірылавіч, каля 70 год**
2. **Масла Іван Паўлавіч**
3. **Масла Бронісь, каля 70 год**
4. **Масла Варвара, каля 55 год**
5. **Масла Броня Паўлаўна, каля 12 год**
6. **Масла Адольф Паўлавіч, каля 10 год**
7. **Масла Сцяпан Аляксандравіч, каля 45 год**
8. **Масла Кацярына Адамаўна, каля 45 год**
9. **Масла Аляксандра Сцяпанаўна, 11 год**
10. **Масла Сарафіна Сцяпанаўна, 7 год**
11. **Масла Уладзімір Сцяпанавіч, 2 гады**
12. **Масла Вольга Сцяпанаўна, 4 гады.**

Мяркую, што сабраныя сведчанні пацярпелых і сведак даюць падставу ўшанаваць памяць бязвінна палеглых уключэннем вёскі Рубры́н Мерлінскага с/с Давыд-Гарадоцкага р-на Пінскай вобласці (цяпер тэрыторыя Столінскага р-на Брэсцкай вобл.) ува ўсе адпаведныя спісы спаленых акупантамі вёсак.

З павагай

А. С. Вячорка,

літаратурны рэдактар

*18 чэрвеня 2013 г.*

**P. S.** Фатаграфіі пацярпелых і сведкаў трагедыі былі далучаныя да папярэдніх матэрыялаў, перададзеных у Фонд міру сп-ні Н. В. Кірылавай.

хатні тэл. (017)3278834